Ба 32889 Кропива

Б 32889 ф

МАЛАДНЯК

# АСЬЦЁ



№ 6

КРАПІВА

Ба 32 889

# АСЬЦЁ

Бел. . аддзел
1934 г.
Ба 32889
БИБЛИОТЕКА

25. 04. 2009

## Я НЕ ПЯСЬНЯР!

Я не пясьняр! Я не мастак!—
Хай так;
Мой твор, ня твор—дзіця,
Мой сьпеў ня сьпеў, а крык,
Але у тон
Пад камэртон
Жыцьця
Мой зык:
Я крыкну—ўраз
Па гушчах мас
Нясецца хваля рэх
І ў свой прабег
Раджае сьмех,
Здаровы сьмех.

## ПРАБОРКА МУЗЕ.

Лаяў сёньня сваю музу я:
„Ах ты, кажу, галапузая!
(Ды абазваў яшчэ сякою-такою)
Што ты, кажу, не даеш супакою
Мне ні ўдзень, ні ў ночы.
Хоць плюй табе ў вочы:
Па вуліцы за мною шыляешся,
Над усімі выскаляешся,
Не зважаеш ні на каго ні крышку
Часамі зачэпіш і важную шышку
Ды лаешся з даўгакосымі
Вось і ходзім з табою мы босымі
Ды чуць ня голыя,
Хоць і працую, як вол я.
А ты, кажу, муза—дура
Не касіся на пуза саўбура,
Не сачы падазрона вачамі
За нэпачамі,
Ды шануй, як скулу, „шышку“
Дык мо' будзе й лепей крышку.

## ЦЁТКАМ НАВУКА.

Вось пакута, дык пакута!
Стогне, енчыць цётка Ўлюта,
Ўжо канае—вот-вот-вот;
Так схапіў яе жывот,
Аж ня знойдзе сабе месца...
Заўжды так, як хто аб‘есца,
Вось і Ўлюце надта крута;
Сем нядзель пасьціла Ўлюта
Пад канец аж шчырым постам
(Верыць, бач, папом прахвостам),
На вялікдзень з галадухі,
Пасьля бульбы й саладухі,
Цётка Ўлюта як прысела,
Дык паўшынкі зразу зьела.
Не дала пасьля за мясам
Яна ганьбы і кілбасам,
Гэтак сама й пірагу,
Гэтак сама й тварагу,
Гэтак сама й парасяці...
Ды ўсяму, што было ў хаце,

Яна ганьбы не давала,
Дык затое-ж ледзь устала,
А праз нейкі час патом
Стала енчыць жыватом.
Як падверне ёй пад грудзі,—
„Гвалт!—крычыць,—ратуйце людзі!
Ох, саколік! Ох, Андрэй!
Па Агату йдзі скарэй!“
Пакуль той прывёў шаптуху,
Дык Улюта ўжо й бяз духу.
Вось, браткі, была ёй мука!
Гэта, цёткі, вам навука.

## „ПРАЛЕТАРЫ“ І „БУРЖУЙ“

**(Путаніца разуменьняў).**

Нос глядзіцца проста ў неба,
Капялюш на ім—што трэба,
Акуляры залатыя,
Аж мігцяць пярсьцёнкі тыя
У суконнай чорнай пары—
То—сапраўдны пролетары.
Бо ён ўласнасьці ня мае,
Калі ў месяц атрымае
Сто рублёў няшчасных некіх
Дык за месяц да капейкі
Усё роўна іх растраціць,
Ну, бо што-ж тут гэта значыць?

* * *

Чорны, змучаны, кудлаты,
Апранаха—адны латы,
Загарэлы нос аблезлы,
На калені порткі зьлезьлі,

Разбарсалася абора
І ў вачох сьвіціцца гора,
Ўвесь да старца ён падобны,
То—буржуй, хаця і дробны,
А чаму—дык гэта ясна,—
Бо ён, бачыш, мае ўласнасьць,
І ня знаецца з рублямі,
Мае рукі з мазалямі,
Жонку—шчуплую кабетку,
(Меў кабылку—здохла ўлетку)
На курыных ножках хату,
Венік, мешалку, лапату.

## ГАНУЛЬЧЫНА ГОРА.

Вось нікому
Ні такому,
Як нашай Ганульцы:
Нават скора
Будзе сорам
Ёй прайсьці па вуліцы:
Мужык чысты
Комуністы,
Сын ў комсамольцах
Трэба сесьці
За стол есьці—
Богу не памоляцца.
Багоў з хаты
Як вар'яты
Яны павыносілі,—
Покут голы
Невясёлы,
Як у краме ў Еселя;

Ўзамен бога
Вунь лысога
Нейкага прынесьлі,—
Мусіць жыда
(Вось агіда!)
На сьцяне павесілі
І Ганульцы
Вось зязюльцы
Памаліцца недзе,—
Як патрэба
Ёсьць да неба,
Дык бяжы к суседзям.
Дык нікому-ж
Ні такому,
Як цётцы Ганульцы,
Вось-жа гора!
Нават сорам
Ёй прайсьці па вуліцы.

## БУДУЙЦЕ ЛАЗЬНІ!

Беларус па вушы гразьне,
Але ў вёсках Беларусі
Днём з агнём ні воднай лазьні
Не знашоў бы нават мусіць.
Ад Барысава да Слуцку
(Аж прызнацца нек нялоўка)
Ўсе прывыклі непалюдзку
Сяк-так боўтацца ў начоўках
Сяк-так дзядзька плечы й грудзі
Папалам памые з горам,
Але далей кажа—„будзе“—
Разьдзявацца, бачыш, сорам.
Нават людзі ёсьць такія,
Што другую палавіну
Ім хто-небудзь толькі мые,
Як кладзе у дамавіну.

Так як кветкі маладзіцы
Тут страчаюцца парою,
Але ніжай паясніцы
Абрасьлі, як ёсьць, карою...
Болей лазьняў, больш здароўя,
Гразь-жа нам нясе хваробу,
Дык збудуйце-ж! клічу зноў я,
Хоць адну на тую спробу.

## СЬВЕТ У КУТ—МЕНШ ПАКУТ.

Пра Ігната на ўсю вёску
Ўжо пусьцілі пагалоску

„Ну й багат!
Як Ігнат“.

Хто цялушкамі й быкамі,
А Ігнат дык едакамі.

Што гадок,
То й ядок.

Хоць з іх болей, як тры чвэрці
Пападае ў лапы сьмерці—

Што зіма,
То й няма.

Як памрэ, Ігнат затое
Адгаблюе разам двое—

Ну й Ігнат!
Лоўкі гад.

І Агата не шманае,
Толькі бога ўспамінае.—

Ўсё ў яе
Бог дае.

А я-б нават пабажыўся
Што бог з ёю не лажыўся—

Ўсё Ігнат
Вінават.

Як хавае, тая маці
Зноў-жа бога вінаваціць—

Як памрэ—
„Бог бярэ“.

Ды няпраўда толькі гэта—
Памыляецца кабета—

Больш дагляд
Вінават,

Бо каб богу былі трэба
Нарабіў бы поўна неба—

Ён жа сьпец
Наш „айцец“...

Так кабета богу й чорту
(Не ўжывае, бач, аборту)

Ўсей брыдзе
Навядзе.

Ад вясельля й да магілы
Шмат патраціць дарма сілы—

То пладзі,
То кладзі.

І нічога не паможа,
Бо на ўсё тут воля божа—

„Бог як даў,
Так і ўзяў“.

Як у беднай сілы хваціць!?..
А каго-ж тут вінаваціць?

Мо' Ігнат
Вінават?

Ня Ігнат і не Агата—
Цемната тут вінавата—

Сьвет у кут—
Менш пакут.

## ТВАРАМ ДА ВЁСКІ.

Поп Мацей—падлізьнік боскі
Павярнуць рашыў да вёскі
Тварам,

І ўжо месяц, як і сёньня
Сыпле казані з амбоні
З жарам.

Дзе памінкі, ці радзінкі,
Ён ня трацячы гадзінкі
Пеша,

Ўзяўшы ўсё сваё „начыньне“,
Падаткнуўшы „аблачэньне“
Чэша.

І на вёсцы ўжо ў Мацея
Аж лабэціна пацее
Часта:



Бо 32889

Ён працуе шчыра й многа,
Не забылася каб бога
„Паства“.

Пацяшае верных раем,
А няверных ён карае
„Адом“,

Але чуць ня ў кожнай хаце
Адварочваюцца к баце
Задам.

Бд 32889

## ТЫ НЯ ЛАЙСЯ, ДЗЯДЗЯ, ПРЫ САВЕЦКАЙ ЎЛАДЗЕ!

Ў хаце сварка-звадка:
Жонка—дэлегатка,
А мужык аж дуба—
Штось яму ня люба.
„Эх, ты дэлегатка!
Як табе ня гадка?
Як табе ня сорам?“
Кажа муж з дакорам;
„Вось папала моду:
Не прапусьціць сходу—
Ўсё язык там чэша,
Ўсё на мужа брэша...
Лепш свае-б кудзелі
Вы, баб‘ё, глядзелі,
А не—вось па карку
Я цябе, пляткарку“...
„Твая справа—вобуй,
А мая—кудзеля,

А кануць папробуй—
Будзеш ў жанаддзеле:
Лепш пайду к разводу,
А ня кіну сходу“,—
Адказала жонка
Голасна і звонка.

* *
*

Не чапай жа, дзядзя,
Ты сваю кабету—
Пры Савецкай ўладзе
Хай паглядзіць сьвету,
Бо й табе лепш будзе,
Калі выйдзе ў людзі.

## ЦІТ ЗАВОДЗІЦЬ НОВЫ БЫТ.

Паглядзеце вы на Ціта:
Вынес ён у хлеў карыта
І падсьвінкаў і сьвіней
Выгнаў з хаты і з сяней.
Ўзяўшы дзетак на падмогу,
Палажыў сяк-так падлогу—
Не на жарты, мусіць, Ціт,
Стаў заводзіць новы быт.
На ўсю зіму вось на гэту
Ціт наш выпісаў газэту—
Хоча ведаць, як відаць,
Што на сьвеце дзе чуваць.
Перад дочкамі й сынамі
Ціт ня лаецца па „маме“,
Ня лупцуе жонкі Ціт,
Ён заводзіць новы быт.
На папа глядзіць Ціт коса
А ў царкву ня ткне і носа.

Ну і з богам, значыць, квіт,
Бо заводзіць новы быт.
Не з апошніх Ціт і ў поле.
Перашоў ён на шматпольле—
Сее рэпу й буракі,
А растуць-жа! Як гаршкі.
Быў узгорак так як бубен,
Але Ціт пасеяў лубін,
Дык, ці веры вы дасьце?
Як чарот, жытцо расьце.
Тодар, Ян, Язэп, Мікіта!
Чым вы горшыя за Ціта?
Дык пачнеце-ж, як і Ціт,
Вы заводзіць новы быт.

## КУЛАК.

У Краўцовага Ігната
Барада, нібы лапата,
Нібы тое памяло,—
Над усё, браткі, сяло.
Шапка—целая авечка,
Нібы буслава гнязьдзечка,
Толькі дзівіцеся вы,
Як ня зьверне галавы.
А кажух!—аўчын мо‘ з восім,
Такіх мы, браткі, ня носім,
Паўаршына той каўнер—
На кулацкі ўсё манер.
Боты тыя як узьдзене,
Дык халявы па калені,
А як пойдзе, дык рыпяць—
Мо‘ чырвонцаў варты з пяць.

А прыхільны-ж ён да ўлады!
Як сабака палцы рады.
І наровіць заўжды гад
Абыйсьці каб як загад;
Калі ўзяць, дык надта хітры,
Калі даць, дык „носік вытры“—
Увільне ня сяк, дык так,
Бо нашто-ж бы быў кулак?

## У СУШНІ.

За паклонамі б'юць церніцы паклон,
За ручайкаю ручайку грызуць лён,
А з-пад церніцы кастрыца так, як сьнег—
Трэплюць бабы языкамі дык аж сьмех.
Перебралі ўжо ўсю вёску дзесяць раз;
Як сягоньня біўся з жонкаю Тарас,
Як аладак дрэнных Тэкля напякла,
Як ад Янкі Манька ўпрочкі уцякла,
Як нядобра накладаюць харчналог,
Як на ўсіх людзей загневаўся ўжо бог,
Бо і людзі ўжо забылі пра яго,
Як Марыля загрубела й ад каго,
Як Тадора шмат нацёрла ўчора льну
І як Польшча абвясьціла нам вайну.
Так у сушні ў нас вядзецца век вяком—
Там найболей бабы трэплюць языком
І пакуль натрэ дзесятак які льну,
Дык абрэша дзесяць раз адна адну
І сьвякруха, і нявестка, і кума,
Хоць ня лепшая ні капелькі й сама.

## ДЗЯДЗЬКА ХВЯДОС І МАЛАКАСОС.

„Што? зноў на сход? ды й зноў даклад?
Вучыць старых ты заўжды рад,
А сам яшчэ малакасос“,—
Сказаў мне раз Хвядос.
„Цяпер з старых дык проста зьдзек...
Пражыў мой дзед і бацька век,
І я дзесятак не адзін
Жыву без вашых тых навін“...
—„Няпраўда гэта. Дзядзька мусіць
Ці памыліўся, ці мо‘ хлусіць,
Ня бачыць, што ў яго пад носам;
Павёў я гутарку з Хвядосам;
„Твайму дзядулю-небараку
Ня раз пан сек лазою сьпіну,
А бацьку плёткай стражнік, пыстаў,—
Вазьмі-ж цяпер сваю ім выстаў.

Твой дзед канякай як блыхою
Капаў сяк-так загон сахою,
А ты цяпер свае загоны
Арэш вунь плугам параконным.
Ты сам, завёўшы гэту спрэчку,
Сярпом нядаўна рэзаў сечку,
Цяпер сячкарняй, а ўжо ў сына,
Дык будзе й лепшая машына.
Жывеш ты ў хаце сьветлай, чыстай,
А варт яна рублёў мо‘ трыста
І ты сьмяешся з дзеда дурня,
Што ён няхайна жыў у курнай.
Дык вось разжуй цяпер ты, дзядзька:
Каб заўжды жыў так сын, як бацька,
А бацька жыў-бы так, як дзед,
Дык і дагэтуль яшчэ сьвет
Такі-б быў самы акурат,
Як тысяч сто гадоў назад:
Ня ўмелі-б хат мы будаваць
Ня ўмелі-б быдла гадаваць
І гатаваць яды-б ня ўмелі,
Зьвяракі нас, мы іх-бы елі,

Адзін другога—хто каго,
А то глядзі вунь да чаго
Дайшоў сучасны чалавек!
Аж дзіўна робіцца ўжо нек:
Ня мае роўных ён нідзе,
Ні пад вадой, ні на вадзе,
Ў паветры лётае так хвацка,
Бо разумнейшы сын, як бацька“.
Падумаў тут Хвядос хвіліну,
Пачухаў пуп, пачухаў сьпіну,
Пасьля сказаў: „Малакасос,
Але падцёр старому нос“.

## У ПІЎНОЙ.

Піва. Піва. Піва.
Шклянкі. Бутэлькі. Куфлі.
Ня дзіва,
Што так распухлі,
Што вядзёрныя ражкі.
Цяжка працуюць! цяжка:
Васьмікуфельны працоўны дзень
Што дзень
І „зьверхурочных“ тузін
Зьмясьціць у пузе—
Гэта-ж вам ня жарты
Такі цяжар.
Сялянскім аддае потам?
Э! што там!
Чаго разважаць?
Развага—вясельлю атрута—

Хай сее той, каму крута,
А ваша справа—жаць,
Ваша ніва—
Піва, піва і піва.
І дрэмле сумленьне маўкліва,
Залітае куфлямі піва.

# ЗЬМЕСТ.

Стар.

1. Я не пясьняр . . . . . . . . . . . . . 5
2. Праборка музе . . . . . . . . . . . . 6
3. Цёткам навука . . . . . . . . . . . . 7
4. „Пралетары“ і „буржуй“ . . . . . . . . . . 9
5. Ганульчына гора . . . . . . . . . . . 11
6. Будуйце лазьні! . . . . . . . . . . . 13
7. Сьвет у кут—менш пакут . . . . . . . . 15
8. Тварам да вёскі . . . . . . . . . . . 18
9. Ты ня лайся, дзядзя, пры Савецкай ўладзе! . . 20
10. Ціт заводзіць новы быт . . . . . . . . . 22
11. Кулак . . . . . . . . . . . . . . 24
12. У сушні . . . . . . . . . . . . . . 26
13. Дзядзька Хвядос і малакасос . . . . . . . 27
14. У піўной . . . . . . . . . . . . . 30

БИБЛИОТЕКА

## КНІЖНІЦА „МАЛАДНЯК“

ЦБ Усебеларускага Аб'яднаньня поэтаў і пісьменьнікаў Маладняк выдае літаратурна-мастацкія зборнікі (вершы, апавяданьні, крытыка) разьмерам ад аднаго да двух друкаваных аркушаў.

Зборнікі прадаюцца ўва ўсіх лепшых кнігарнях і кіосках Беларусі, а таксама на галоўных станцыях чыгунак, якія праходзяць цераз БССР.

У траўні месяцы 1925 г. вышлі:

1. **Міхась Чарот**—Выбраныя вершы.
2. **Ул. Дубоўка**—Там, дзе кіпарысы (*поэма*).
3. **Кузьма Чорны**—апавяданьні.
4. **Адам Бабарэка**—апавяданьні.
5. **Язэп Пушча**—Раніца рыкае (*вершы*).
6. **Крапіва**—Асьцё (*сатыры*).
7. **Маладняк — Янку Купалу** (юбілейны зборнік).

У чэрвені выйдзе 7 наступных зборнікаў, а ў ліпені 6.

1964 г.

**Цана 15 к.**

Бел. вклеек
1934 г.

†

B0000003075377